## Саламяныя павукі - цуд у тваіх руках
## Вопыт арганізацыі работы з вучнямі па саломапляценні

**Л. М. Дзядкова,**
настаўнік нацыянальных рамёстваў вышэйшай катэгорыі
беларускамоўнай гімназіі №2 г. Барысава

**На працягу дзесяцігоддзяў саломапляценне і аплікацыя з саломкі з'яўляюцца візітнай карткай нашай краіны, сімвалам беларускай дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Вырабы з саломкі не маюць аналагаў у Еўропе. Гэта цікавы феномен сучаснага прыкладнога мастацтва і гонар беларусаў.**

**Імклівае і бурнае развіццё набылі гэтыя віды рамёстваў у другой палове XX стагоддзя. І сёння развіццё майстэрства саломапляцення не спыняецца, яно заваёўвае новых прыхільнікаў, прыцягвае да творчых настаўнікаў таленавітых вучняў. Дзейнасць дзіцячых калектываў, дзе вывучаюцца асновы работы з саломкай, таксама аказвае ўплыў на развіццё гэтага рамяства.**

У беларускамоўнай гімназіі № 2 г. Барысава ў 2006 г. была створана студыя «Захапленне». Дзяўчынак і хлопчыкаў розных узростаў цікавіла пытанне, як з простых, звычайных каласкоў можна стварыць цікавыя цацкі, абярэгі, упрыгожванні для дому, прадметы побыту. Разам мы пачалі шукаць адказ на гэта пытанне, крок за крокам авалодвалі сакрэтамі саломапляцення. І сёння калектыў мастацкай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Захапленне» за поспехі ў развіцці аматарскай творчасці, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, высокі мастацкі ўзровень і актыўную выставачную дзейнасць мае званне ўзорнага аматарскага калектыва Рэспублікі Беларусь.

Самыя малодшыя ўдзельнікі калектыву – вучні 2–3 класаў. Авалоданне традыцыйнымі асновамі саломапляцення з'яўляецца галоўнай мэтай гімназістаў на працягу першага года навучання. Вучыцца плесці саламяныя элементы – гэта цяжкая і карпатлівая праца, якая патрабуе значных намаганняў. Дзецям цікава плесці не асобныя дэталі, а ствараць пэўны твор, таму ўсе наплеценыя элементы

мы пераўтвараем у гатовыя вырабы: «бусіны», «зорачкі», «квадраты» ідуць на ўпрыгожванне саламянага павука; дыванок і «зубатка» ўтвараюць падстаўку пад кружку; «вітушка» сшываецца ў кола, упрыгожваецца атласнымі лентамі – і перад вачамі паўстае ёлачная цацка. Гэта вялікі цуд – бачыць, як у маленькіх руках з ломкай саломкі ствараюцца цудоўныя рэчы. А колькі радасці атрымлівае дзіця ад створанага сваімі рукамі!

Пашырэнне эстэтычных магчымасцей шляхам камбінавання сучасных прыёмаў пляцення з традыцыйнымі, удасканаленне майстэрства саломапляцення, стварэнне індывідуальных і калектыўных творчых работ – задачы наступных гадоў навучання.

Адкрыццё сваёй непаўторнай індывідуальнасці ў творчасці дапамагае школьнікам рэалізаваць сябе ў вучобе, у зносінах з сябрамі. Работа з рознымі матэрыяламі, у розных мастацкіх тэхніках пашырае магчымасці вучняў, развівае ўяўленне, творчыя здольнасці.

На занятках у студыі заўсёды пануе атмасфера супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі паміж настаўнікам і вучнямі. А гэта мае вялікае значэнне пры выкананні складаных калектыўных творчых работ. Неабходна падрыхтаваць шмат эскізаў, выбраць найлепшыя ідэі і аб’яднаць іх у адзіны твор. На ўсіх гэтых этапах галоўнымі дзеючымі асобамі з’яўляюцца вучні, а роля настаўніка заключаецца ва ўмелым уключэнні ў работу новых элементаў і тэхнік, многія з якіх запазычваюцца з культур іншых народаў. Гэта надае своеасаблівую непаўторнасць творам. Напрыклад…

На працягу 10 год існавання калектыву было створана больш за 100 творчых работ, якія ўтвараюць выставачную экспазіцыю ў гімназіі. Шмат аб’ёмных кампазіцый з выявамі жывёл, птушак, лялек, кветак прываблівающь гледачоў. Розныя саламяныя фігуры – гэта не проста цацкі. Яны маюць глыбокі сэнс. Так, конь – герой многіх казак, ён заўсёды суправаджаў мужчыну і быў яму сябрам, ахоўнікам і дарадцам; каза – сімвал ураджаю і пладавітасці, лялька – вобраз Прамаці, абаронца жанчын; птушкі – душы продкаў, якія ахоўваюць людзей і дапамагаюць ім.

Асобную частку гімназічнай экспазіцыі займаюць саламяныя павукі. Яны маюць сімвалічнае значэнне, з’яўляюцца ахоўнікамі хаты і забяспечваюць

дабрабыт сям’і. Сабраныя з дзясяткаў, нават соцень саламяных трубачак у адзіную кампазіцыю, канструкцыі падвешваліся на нітцы ў самым ганаровым чырвоным куце дома, над сталом.

Вашай увазе прапануем **заняткі студыі «Гістарычнае прызначэнне саламяных павукоў і іх роля ў жыцці беларусаў»** (4 клас).

**Мэта:** фарміраванне ў вучняў уяўленняў аб выглядзе і прызначэнні саламяных павукоў.

**Задачы:**

- пашырыць кругагляд вучняў звесткамі аб гістарычным прызначэнні павукоў;
- пазнаёміць з асаблівасцямі формаўтварэння, паслядоўнасцю зборкі і дэкарырвання нацыянальных беларускіх падвесных канструкцый;
- развіваць памяць, увагу, мысленне вучняў;
- выхоўваць цікавасць да нацыянальнай культурнай спадчыны, да жыцця беларускага народа.

**Матэрыялы:** фотаздымкі саламяных павукоў, эскіз павука рамбічнай канструкцыі, салома, нажніцы, ніткі.

**Ход заняткаў**

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Вучням прапануецца наведаць незвычайную краіну «беларускіх павукоў». Пры сабе неабходна мець толькі добры настрой і матэрыял для працы (салому, нажніцы, ніткі).

**II. Актуалізацыя апорных ведаў**

Веды вучняў вызначаюцца ў ходзе гульні «Хлопні ў далоні». Настаўнік чытае сцвярджэнні (напрыклад: адзін з самых распаўсюджаных беларускіх абярэгаў – павук; майстры плятуць з сухой саломы). Калі сцвярджэнне вернае – вучні хлопаюць у далоні.

**III. Паведамленне новага матэрыялу**

***Настаўнік.*** Зажынкі і дажынкі – пачатак і канец жніва – святы, якія са старадаўніх часоў спраўлялі ў Беларусі. З першых і апошніх каласоў рабілі снапы. Апошні зваўся «барадой», яго ўпрыгожвалі стужкамі, кветкамі, асвячалі, пасля чаго з песнямі, бразганнем сярпоў неслі ў хату і ставілі ў кут. Снапы, што стаялі ў хаце да наступнага ўраджая, з’ўляліся своеасаблівымі амулетамі-абярэгамі, якія

прыносілі дабрабыт і багацце ў сям'ю. Пазней, калі ў чалавека з'явіліся эстэтычныя патрэбы, з гэтых снапоў пачалі плесці разнастайныя прыгожыя рэчы – лялек, птушак, павукоў, дэкаратыўны посуд.

Як вы лічыце, які выраб замест снапа пачаў выконваць ролю абярэга? (*Павук.*)

Павука ў сялянскіх сем'ях вывешвалі перад Новым годам на самым пачэсным месцы – у чырвоным куце. Строгая гармонія яго форм і руху былі заклікаíы аберагаць хату і яе гаспадароў. Павук уцягваў у сваё павуцінне ўсё негатыўнае, усё тое, што магло перашкодзіць шчасліваму цячэнню жыцця сям'і. Кожны год паўтараўся цыкл: стары павук спальваўся, і на яго месца вывешваўся новы.

Як сапраўдны павук пляце сваё павуцінне, так і майстар з мноства саламяных трубачак збірае сваю незвычайную канструкцыю. У руках майстра быццам ствараецца цэлы свет.

Найбольш старажытнай з'яўляецца аб'ёмна-рамбічная форма павука (актайдэр). Ромб – гэта сімвал зямлі і матэрыяльнага свету. Кожны асобны ромб – фрагмент павука – складаецца з 12 аднолькавых па даўжыні саломін, сабраных на нітку, нібы нагадвае пра 12 гадзін, 12 месяцаў – адзінак часу. Злучэнне некалькіх такіх фігур дае магчымасць атрымаць разнастайныя канструкцыі павукоў.

Чым жа ж дэкарыраваўся павук? Падвесныя канструкцыі нашы продкі ўпрыгожвалі кутасікамі, сонейкамі, ланцужкамі. Таксама выкарыстоўвалі розныя падручныя матэрыялы: каляровую паперу, абёрткі ад цукерак, фальгу, кавалачкі тканіны. Дэкаратыўнымі дэталямі служылі каласкі жыта, аўса, пер'е хатняй птушкі, зерне гароху, фасолі, сухія ягады рабіны.

**IV. Самастойная работа**

***Настаўнік.*** Сёння мы створым самую простую канструкцыю павука згодна з прапанаваным эскізам.




*(Паэтапны паказ і выраб павукоў рамбічнай канструкцыі.)*

**V. Падвядзенне вынікаў**

1. Дэманстрацыя павукоў, створаных вучнямі.

2. Выніковая гутарка:

- ✓ У якім месцы ў хаце і ў які час вывешвалі павукоў?
- ✓ Растлумачце прызначэнне павукоў.
- ✓ Назавіце самую старажытную форму павука.
- ✓ Чым дэкарыраваўся павук?

**VI. Рэфлексія**

Вучням прапануецца выказаць сваё меркаванне адносна праведзеных заняткаў і вызначыць свой настрой.

З 2008 г. узорны аматарскі калектыў мастацкай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Захапленне» з’яўляецца пастаянным удзельнікам рэспубліканскага конкурсу «Калядная зорка». Творчая работа «Шчаўкунок і Мышыны Кароль» атрымала дыплом II ступені ў 2015 годзе ў намінацыі «Інтэр’ерная лялька». Работы гімназістаў экспануюцца на выставах розных узроўняў.

У 2014 і 2016 гг. у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» падчас рэспубліканскага конкурса «Юныя таленты Беларусі» гімназісты прадстаўлялі свае работы, праводзілі майстар-класы па тэхніцы саломапляцення, дзяліліся са сваімі сябрамі сакрэтамі рамяства. Калектыў атрымаў гран-пры і высокую ўзнагароду «Крыштальны зубр».

Калектыў «Захапленне» знаходзіцца ў пастаянным творчым пошуку, шукае новыя ідэі і заўсёды рухаецца наперад. А стымулююць гэта сустрэчы с калегамі, творчымі вучнёўскімі калектывамі, удзел у майстар-класах, знаёмствы з аматарамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

## Літаратура

1. **Лабачэўская, В. А.** Народнае мастацтва саломапляцення / В. А. Лабачэўская // Народныя мастацкія рамёствы Беларусі (метадычны дапаможнік) / уклад. Я. М. Сахута. – Мінск: Беларусь, 1996.

2. **Лобачевская, О. А.** Плетение из соломки / О. А. Лобачевская. – М., 2000.

3. **Сахута, Я. М.** Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1997.